## Imperativus praesentis activi

Imperatīvus praesentis actīvi (загадны лад цяперашняга часу незалежнага стану) існуе ў другой асобе (напрыклад, *рабі*, *рабіце*) і ўтвараецца наступным чынам:

| Спражэнне | 2-я асоба singulāris | 2-я асоба plurālis |
|---|---|---|
| I, II, IV | = аснове infectum | аснова infectum + **te** |
| IIIa | аснова infectum + **e** | аснова infectum + **ĭ-te** |
| IIIб | = аснове infectum, але **ĭ** > **ĕ** | аснова infectum + **te** |

**Узоры ўтварэння**

| Спражэнне | Дзеяслоў | Аснова | 2-я асоба singulāris | 2-я асоба plurālis |
|---|---|---|---|---|
| I | laudo, 1 — *хваліць* | laudā- | lauda! | laudā-**te**! |
| II | doceo, 2 — *вучыць* | docē- | doce! | docē-**te**! |
| IIIa | scribo, 3a — *пісаць* | scrib- | scrib-**e**! | scrib-**ĭ**-**te**! |
| IIIa | struo, 3a — *будаваць* | stru- | stru-**e**! | stru-**ĭ**-**te**! |
| IIIб | capio, 3б — *браць* | capĭ- | cape! | capĭ-**te**! |
| IV | audio, 4 — *слухаць* | audī- | audi! | audī-**te**! |
| — | sum, esse — *быць* | es- | es! | es-**te**! |

З а ў в а г а. Чатыры дзеясловы ўтвараюць загадны лад у 2 *sg*. няправільна:

| Дзеяслоў | 2-я асоба singulāris |
|---|---|
| dico, 3 — *гаварыць* | dic! |
| duco, 3 — *весці* | duc! |
| facio, 3 — *рабіць* | fac! |
| fero, ferre — *несці* | fer! |

## Выказванне забароны

Забарона перадаецца спалучэннем слоў **noli** (2 *sg*.), **nolīte** (2 *pl.*) з формай *inf. praes. act.*: noli facĕre – *не рабі*, nolīte facĕre – *не рабіце*.